© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

# Бацькаўшчына

**ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ**

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAČKAUŠČYNA" („VATERLAND")

Herausgeber: Wladimir BORTNIK

Die Administration: München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

Druck: „LOGOS", Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 8, Rosenheimer Str. 46 a

**Цана паза Нямеччынай:** ЗША — 15 цэнтаў, Канада — 15 ц., Ангельшчына — 1 шылінг, Францыя — 40 фр., Бэльгія — 5 фр., Аўстралія — 1 шылінг, Аргентына — 2 пэзо. У іншых краінах раўнавартасьць 15 ам. цэнтаў. Падпіска на год — з разьліку 52 нумароў, на паўгода — 26 нумароў, на 3 месяцы 13 нумароў паводля вышэйшае цаны. Цана лётніцкай поштай у заакіянскія краіны — 30 ам. цэнтаў. — Падвойныя нумары каштуюць падвойна

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

| | | |
|---|---|---|
| LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE" | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" |

№ 28 (159) Нядзеля 12 ліпеня 1953 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 7

# Кіпіць за зялезнай заслонай

Антысавецкае паўстаньне ўсходня-нямецкіх работнікаў, здушанае савецкімі танкамі, фактычна яшчэ не закончылася. Дзень за днём прыходзяць весткі аб новых работніцкіх забастоўках і дэманстрацыях, адказам на якія зьяўляюцца некаторыя палёгкі на карысьць работнікаў з аднаго боку й тэрор і перасьледваньні з боку камуністычнага ўраду, г. зв. «народнай паліцыі», а навет савецкіх акупацыйных уладаў — з другога. Апошнімі днямі ўспыхнулі ў усходнім Бэрліне новыя работніцкія забастоўкі пад лёзунгам звальненьня арыштаваных дзесяткаў тысячаў работнікаў за ўдзел у чэрвенскіх дэманстрацыях. На многіх прадпрыемствах работнікі, праўда, зьяўляюцца да працы, але работы не пачынаюць або спэцыяльна выконваюць вельмі нізкія нормы. Апошнія паведамленьні гавораць, што забастоўкі перакінуліся цяпер таксама на сельска-гаспадарскіх работнікаў усходня-нямецкіх калгасаў.

Паўстаньне ў Усходняй Нямеччыне сталася сыгналам да паважных масавых антысавецкіх заварушэньняў і ў сатэлітных краінах, у якіх, як і ў Нямеччыне, пераважна прыймаюць удзел работнікі. Гэтак, як падае нямецкае радыё й прэса, у ночы зь 1 на 2 ліпеня вялікая колькасьць савецкіх танкаў, якія ўспакойвалі Бэрлінскае паўстаньне, была накіраваная на ўсход ад Одры з мэтаю «ўтрыманьня супакою ў Польшчы». Некалькі дзён перад гэтым на Захад пранікклі весткі, што ў Польшчы пачаліся масавыя антысавецкія заварушэньні.

Пазьней Паўночнанямецкае радыё паведаміла, што ўдзельнікам польскага падземнага руху ўдалося перарваць чыгуначную сувязь між Берасьцем і Франкфуртам над Одрай. У сувязі з гэтым Саветы былі змушаныя затрымаць у Франкфурце над Одрай 12 цягнікоў з рэпарацыйнымі матарыяламі зь Нямеччыны. У Польшчы заварушэньні распачаліся таксама між шахцёрамі Домброўскага вугальнага басэйну. Работнікі капальні «Генэрал Завадзкі» на знак пратэсту супраць новага павялічэньня нормаў працы і дрэннага харчаваньня пакінулі працу й абвесьцілі забастоўку. Міліцыя не змагла здушыць забастоўкі й мусіла зьвярнуцца за помаччу да аддзелаў бясьпекі. Адначасна выбухнула заварушэньне між работнікамі верхня- і ніжнасілескага прамысловага раёну, якое пашырылася й на тэкстыльны цэнтр Лодзь. Польскія работнікі вымагалі агульнага скасаваньня ў сярэднім на 30% паднятых нормаў працы і анулюваньня дзевяцігадзіннага работніцкага дня, заведзенага звыш год таму назад.

Паводля паведамленьняў уцекачоў, асабліва вялікія заварушэньні ўспыхнулі ў занятых Палякамі раёнах Одры. На ўсходнім прадмесьці Франкфурту над Одрай яно напала на адзін кінотэатр, у якім высьвятляўся савецкі фільм. Адкліканыя з савецкага сэктару Бэрліна савецкія танкі ўжываюцца часткова тут, а часткова ў Кістрыне й іншых мясцовасьцях на ўсходнім беразе Одры.

На знак пратэсту супраць існуючай сыстэмы прамысловыя работнікі ў Польшчы адмаўляюцца ад работніцкіх адзначэньняў. Навет перадавы польскі «герэй працы» Віктар Макевка, шахцёр зь верхнясілескага вугальнага басэйну, прылучыўся да руху пратэсту і адаслаў у міністэрства вугальнай прамысловасьці ў Варшаве ўсе свае ордэны й адзначэньні. У пісьме да міністэрства ён абвінавачвае кіраўніцтва шахты ў «ашуканстве работнікаў». У сувязі з замоўчваньнем аб адсыланьні работнікамі іхных адзначэньняў быў распачаты рад дысцыплінарных працэсаў супраць кіраўнікоў прадпрыемстваў. Гэтак начальнік аддзелу кадраў міністэрства вугальнай прамысловасьці Анджэйчак быў звольнены із свайго становішча й заменены фанатычным камуністым Гроноўскім.

Весткі, якія надыйшлі із Штокгольму, рэжымовыя газэты пішуць аб тым, што пацьвярджаюць антысавецкія выступленьні ў Польшчы, таксама й польскія

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

# ЗМАРНАВАНАЯ НАГОДА

Сяньня савецкая імпэрыя перажывае глыбокі крызыс, які наступіў у выніку сьмерці Сталіна. Калі разглядаць Савецкі Саюз, як найвялікшае сусьветнае зло, жарало найвялікшых няшчасьцяў і няўхільную прычыну будучага новага сусьветнага катаклізму, — а такім разглядаць яго трэба — то ўсё вольнае чалавецтва дзеля собскага ратунку павінна імкнуцца гэтае зло зьнішчыць, зьнішчыць праступную савецкую сыстэму й ніколі не заспакоены расейскі імпэрыялізм. Само сабой зразумела, што пажаданае такое зьнішчэньне бальшавізму, якое каштавала-б найменей ахвяраў. Таму станоўчы ўдар па савецкай імпэрыі павінен быць нанесены ня ў пэрыяд ейнае магутнасьці, але якраз у хвіліну найбольшае слабасьці. Такую слабасьць перажывае Савецкі Саюз якраз сяньня.

Падобныя крызысовыя хвіліны перажываў Савецкі Саюз ня раз і перад гэтым. Першым такім крызысовым пэрыядам былі гады, калі савецкія правадыры дзеля ратаваньня ад немінучай гібелі створанай імі сыстэмы былі змушаныя ад камуністычнай дактрыны часткова павярнуць да сыстэмы капіталістычнай, абвяшчаючы г. зв. новую эканамічную палітыку або НЭП. У той-жа самы час Сталін, заняты змаганьнем за ўладу і ліквідацыяй апазыцыі ў партыі, ня меў магчымасьці здушыць нацыянальных адцэнтравых рухаў нерасейскае палавіны насельніцтва, якія прадстаўлялі запраўдную загрозу існаваньня савецкай імпэрыі. Патрэбная была невялікая, але наважаная й сваячасовая помач Захаду як у галіне палітычнай, гэтак і матарыяльнай, каб савецкі колёс разваліўся пад ударам нацыянальных сілаў нерасейскіх народаў навет бязь ніякай мілітарнай інтэрвэнцыі звонку.

Але Захад, не прадбачучы тады будучай небясьпекі з Усходу, ня толькі ня быў зацікаўлены у зьнішчэньні савецкай сыстэмы, але навет не праяўляў ніякага зацікаўленьня вызвольнымі рухамі нерасейскіх народаў якія, калі савецкая ўлада ўстабілізавалася і ўмацавалася, былі крывава здушаныя. Гэтай нагоды, якая няўхільна магла-б прывесьці да зьнішчэньня бальшавізму, Захад не хацеў тады выкарыстаць.

Другой такой нагодай быў пэрыяд прымусовай калектывізацыі трыццатых гадоў. Увесь Савецкі Саюз быў тады на столькі глыбака падмінаваны ўсенародным незадаваленьнем і ненавісьцю, якія вылліліся ў стыхійныя бунты й паўстаньні. Хапіла-б належна зарганізаванай помачы з боку Захаду, каб Савецкі Саюз разваліўся пад ударам народнага гневу. Але Захад, заняты тады ўстанаўленьнем прыязных дачыненьняў з Савецкім Саюзам, не праявіў навет належнага зацікаўленьня гэтым нутраным працэсам у Саветах і не захацеў таксама яго выкарыстаць.

Але калі ў часы найбольш усіленых антысавецкіх нацыянальных рухаў і ў пэрыяд калектывізацыі Захад аставаўся ў ролі абыякавага і мала зацікаўленага абсэрватара, дык гэта яшчэ да некаторай меры можна зразумець. Ня гледзячы на камуністычны лёзунг сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, Савецкі Саюз, ня чуючыся яшчэ на сілах, не зраджаў яшчэ ніякіх агрэсыўных намераў і не загражаў вольнаму сьвету. Затое робіцца проста дзіўнай, незразумелай і недарэчнай у сваей парадаксальнасьці пазыцыя Захаду сяньня, калі Савецкі Саюз уступіў у новую фазу глыбокага крызысу й бясьсільля. Цяперашняя пазыцыя вольнага сьвету розьніцца ад папярэдніх толькі тым, што цяпер Захад, адчуўшы на собскай скуры ўвесь цяжар савецкай імпэрыялістычнай палітыкі, жыва цікавіцца й пільна сочыць за ўсім тым, што робіцца па той бок зялезнай заслоны. Але далей гэтага зацікаўленьня рэакцыя Захаду, на жаль, ня йдзе.

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

# Палітычныя Навіны

**(1—7 ЛІПЕНЯ 1953)**

**Паўдзённая Карэя супраць кампрамісаў.** Паўдзённа-карэйскі прэзыдэнт Сынгман Ры 6 чэрвеня спаткаўся із спэцыяльным высланьнікам ЗША Робэртсонам ужо дзевяты раз на тайным паседжаньні ў справе пераміра'я ў Карэі. Робэртсон прадставіў Сынгману Ры новы двухпунктовы амэрыканскі праект кампрамісу, які дазволіў-бы Сынгману Ры згадзіцца на заключэньне пераміра'я, захоўваючы пры гэтым свой прэсьціж. Аднак і гэты праект прэзыдэнт Паўдзённай Карэі адкінуў. У сувязі з гэтым адзінаццацідзённыя перагаворы не далі ніякіх вынікаў. На фроньце ваенныя дзеяньні ў сувязі з уліўнымі дажджамі амаль што спыніліся.

**177 год незалежнасьці Амэрыкі.** 4 ліпеня сёлета ў ЗША, а таксама Амэрыканцамі ў цэлым сьвеце была ўрачыста адзначаная 177 гадавіна абвешчаньня незалежнасьці Задзіночаных Штатаў Амэрыкі. Прэзыдэнт Айзэнгаўэр заклікаў усіх Амэрыканцаў прысьвяціць гэты дзень малітвам за шчасьлівае разьвязаньне найцяжэйшых праблемаў сучаснасьці.

**Зьмена ўраду ў Мадзяршчыне.** У мінулым тыдні была праведзеная радыкальная зьмена мадзярскага ўраду. На месца дасюлешняга прэм'ера М. Ракошага нававыбраны 17 травеня парлямант зацьвердзіў на становішчы прэм'ера дасюлешняга заступніка прэм'ера Імрэ Надзі. Дасюлешні прэм'ер Ракошы, міністар замежных справаў Э. Мольнар, міністар абароны М. Фаркаш і міністар юстыцыі Б. Ковачс у новы ўрад не ўвайшлі. Колькасьць сяброў ураду з 26 асобаў цяпер зьменшаная да 19.

**Цікавы закон векам аднаго тыдня ў Чэхаславаччыне.** У Чэхаславаччыне быў 1 чэрвеня выдадзены на ўзор савецкі драконскі закон, на падставе якога работнікі маглі зьмяняць месца сваей працы толькі з дазволу кіраўніцтва прадпрыемства. Закон таксама прадбачыў суровыя кары за спазьненьні на працу й нявыкананьне працоўных нормаў. Пасьля аднаго тыдня, пайменна 7 чэрвеня, гэты закон быў неспадзявана адкліканы новым урадавым распараджэньнем.

**Павялічэньне сувэрэнітэту Індакітаю.** Французскі ўрад выслаў да трох індакітайскіх дзяржаваў Камбоджы, Ляёсу й Ветнаму ноту, у якой выразіў сваю гатоўнасьць паддаць рэвізіі дасюлешні дагавор з гэтымі дзяржавамі ў кірунку павялічэньня іхнага сувэрэнітэту. У той час, калі Ветнам і Ляёс аднесьліся да французскага праекту пазытыўна, вызнаючы яго за здавальняючы, Камбоджа аднеслася да яго нэгатыўна. Прэм'ер Камбоджы схарактарызаваў французскі праект большай палітычнай і гаспадарскай незалежнасьці краіны, як «недастатковы» і дамагаўся для Камбоджы такога становішча, якое мае Індыя ў брытанскім камэнвэльце.

**17 чэрвеня дзяржаўным сьвятам Нямеччыны.** Нямецкі парлямант выдаў 3 ліпеня закон, на падставе якога дзень 17 чэрвеня, калі выбухнула рэвалюцыя ўсходня-бэрлінскіх работнікаў, праклямаваны «Днём нямецкага адзінства». Гэты дзень будзе абходзіцца як нацыянальнае сьвята. Адначасна будзе ён днём успаміну паўстаньня й дэманстрацыяў усходняга Бэрліну за сваю свабоду.

**Работнікі савецкай зоны выступаюць з прафсаюзаў.** Звыш 30.000 сяброў «Вольнага Нямецкага Прафэсыянальнага Саюзу» пасьля 17 чэрвеня пакінула рады гэтага Саюзу ў сувязі з тым, што гэтая арганізацыя дзеіць супраць інтарэсаў нямецкіх работнікаў. Ужо толькі згода на падвышэньне работніцкай нормы не дае гэтай арганізацыі права прадстаўляць інтарэсаў работнікаў, якая фактычна зьяўляецца «інструмэнтам палітычнай улады».

**Галоўнай тэмай Вашынгтонскай канфэрэнцыі пытаньне Нямеччыны.** Галоўнай тэмай канфэрэнцыі трох міністраў замежных справаў ЗША, Вялікабрытаніі й Францыі, якая распачнецца 10 ліпеня

**Бацькаўшчына 2**

ў Вашынгтоне, будзе, як асьветчыў міністар замежных справаў ЗША Даллес, выпрацаваньне супольнай лініі ў нямецкім пытаньні. Міністар асьветчыў, што канфэрэнцыя будзе таксама займацца праблемамі паўстаньня нямецкіх работнікаў і антысавецкіх заварушэньняў у сатэлітных дзяржавах. У справе Нямеччыны галоўная ўвага будзе зьвернутая на пытаньне задзіночаньня Нямеччыны й правадзеньня агульных выбараў.

**Нямецкі парлямант супраць спатканьня чатырох.** Невялікай бальшынёй галасоў ніжняя палата нямецкага парляманту ў Бон адкінула прапазыцыю сацыялдэмакратаў, якая дамагалася ад заходніх вялікадзяржаваў скліканьня канфэрэнцыі з Савецкім Саюзам у справе Нямеччыны, якая мусіла-б адбыцца непасрэдна пасьля закончэньня канфэрэнцыі міністраў замежных справаў ЗША, Вялікабрытаніі й Францыі, што распачнецца ў Вашынгтоне 10 ліпеня. Канцлер Адэнаўэр заявіў, што ён зьяўляецца прыхільнікам такой канфэрэнцыі, але адначасна зазначыў, «што нельга чакаць, каб кіраўнікі Захаду прасілі Расейцаў на каленьнях размоваў вялікай чацьвёркі».

**Новыя дэманстрацыі ў савецкай зоне Нямеччыны.** У сувязі з катастрафальным забясьпечваньнем насеніцтва Усходняй Нямеччыны харчовымі прадуктамі ў многіх мясцовасьцях дайшло апошнімі днямі да новых пратэстаў, дэманстрацыяў і работніцкіх штрайкаў. Гэта прымусіла камуністычны ўрад Усходняй Нямеччыны адпусьціць для насельніцтва ўсе дзяржаўныя запасы прадуктаў. Адначасна даходзяць весткі аб масавых арыштах і тэрарыстычных судовых прыгаворах асабліва ў прамысловых акругах.

**Вызаў савецкіх амбасадараў у Маскву.** Савецкі ўрад неспадзявана вызваў у Маскву сваіх амбасадараў з заходніх дзяржаваў: Паўлава з Парыжа, Маліка зь Лёндану й Зарубіна з Вашынгтону. У Маскву выкліканыя таксама й некаторыя генэралы нямецкай акупацыйнай арміі ў Нямеччыне. Аб прычынах гэтага вызаву пакуль што нічога ня ведама.

**Італія перад новым урадам.** Згодна зь італьянскай канстытуцыяй урад дэ Гаспэры падаўся ў вадстаўку, каб даць магчымасьць новаму парляманту, які быў выбраны 7 чэрвеня, зацьвердзіць новы ўрад. Прэзыдэнт Італіі Эйнаўдзі даручыў 3 ліпеня дэ Гаспэры стварэньне новага ўраду.

**Вольныя прафсаюзы асуджаюць савецкі тэрор.** Міжнародны Саюз Вольных Прафэсыянальных Саюзаў на сваім сусьветным кангрэсе, які цяпер адбываецца ў Штокгольме, войстра асудзіў ужыцьцё савецкага войска й панцыраў супраць работнікаў савецкай зоны Нямеччыны й высунуў дамаганьне задзіночаньня Нямеччыны шляхам вольных выбараў.

**Нямецкія прадстаўнікі вызнаныя амбасадарамі.** Прэзыдэнт нямецкай саюзнай рэспублікі праф. Гойс на прапазыцыю ўраду вызваў нямецкіх урадавых прадстаўнікоў у Вашынгтоне, Лёндане й Парыжы амбасадарамі. Таксама тры заходнія высокія камісары ў Нямеччыне атрымліваюць рангу амбасадараў.

**Францускія сацыялістыя ў справе эўрапэйскай арміі.** Сацыялістычная партыя Францыі на сваім 45-ым партыйным кангрэсе 5 ліпеня высказалася бальшынёй 1.187 супраць 228 галасоў за праектам калектыўнай бясьпечнасьці й эўрапэйскай абароннай супольнасьці пад наступнымі ўмовамі: праект дагавору аб эўрапэйскай арміі будзе ўнесены ў парлямант пасьля нямецкіх парляманцкіх выбараў, 2. Амэрыканцы дадуць гарантыю супраць магчымага «выламаньня» аднаго зь сяброў эўрапэйскай абароннай супольнасьці, 3. Вялікабрытанія ўзмоцніць сваю сувязь з эўрапэйскай абароннай супольнасьцю.

**Грунтэр пераймае галоўнакамандаваньне НАТО.** У сувязі з назначэньнем генэрала Рыджвэя шэфам генэральнага штабу амэрыканскай арміі апарожненае па ім месца галоўнакамандуючага збройнымі сіламі Атлянтычнага Пакту 11 ліпеня пяройме амэрыканскі генэрал Грунтэр.

**Саветы супраць міту Лысенкі.** Савецкая навуковая прэса войстра заатакавала тэорыю спадковасьці ведамага савецкага біялёга Трафіма Лысенкі. За жыцьця Сталіна Лысенка здабыў сабе ў савецкай навуковай біялёгіі манапольнае, навет дыктатарскае становішча, як найбольш мерадайны інтэрпрэтатар тэорыі спадковасьці «згодна з дактрынай матэрыялізму».

**Антысавецкае каўстаньне ўсходня-наступны год.** Амэрыканскі сэнат 1 ліпеня зацьвердзіў амэрыканскую замежную помач на наступны год, пачынаючы ад 1 ліпеня 1953 г., у суме 5,3 мільярдаў даляраў і пастанавіў дня 30 чэрвеня 1956 году разьвязаць адміністрацыю амэрыканскай замежнай помачы, ведамую пад назвай «Урад Узаемнай Бясьпечнасьці». Гэты ўрад ад 30 чэрвеня 1955 г. ня будзе мець права браць на сябе ніякіх новых забавязаньняў. Гэтая пастанова не абазначае, што пасьля 30 чэрвеня 1956 г. усякая амэрыканская помач для запрыязьненых краінаў будзе ўстрыманая, затое будзе яна адміністраваная міністэрствам замежных справаў.

**Лётніцкія манэўры НАТО.** Роўна 1.800 самалётаў 9 краінаў возьме ўдзел у вялікіх лётніцкіх манэўрах НАТО, якія адбудуцца ў канцы ліпеня над Сярэдняй Эўропай.

# Упадак Бэрыі

**Міністар нутраных справаў Савецкага Саюзу Лаўрэнці Бэрыя, як паведаміла маскоўскае радыё раніцай 10 ліпеня, зьняты із свайго становішча, адначасна выключаны з камуністычнай партыі і арыштаваны. Радыё паведаміла далей, што гэтыя мерапрыемствы былі праведзеныя пасьля ўстанаўленьня «зраднай і супраць дзяржавы накіраванай ягонай дзейнасьці, якая мела на мэце падмінаваньне савецкай дзяржавы ў інтарэсах замежнага капіталу».**

**Як далей паведаміў «ТАСС», пастанова аб зьняцьці Бэрыі зь ягонага становішча запала на паседжаньні цэнтральнага камітэту камуністычнай партыі Савецкага Саюзу, на якім Маленкаў зглажыў падробную справаздачу аб «крымінальнай і варожай партыі й дзяржаве дзейнасьці» Бэрыі. Бэрыя абвінавачваецца ў тым, што імкнуўся падмінаваць савецкую дзяржаву ў інтарэсах замежнага капіталу й падпарадкаваць савецкі ўрад і партыю міністэрству нутраных справаў. Далей у камунікаце сказана, што Бэрыя будзе адказваць перад Вярхоўным Судом Савецкага Саюзу.**

**Наступнікам Бэрыі на становішчы міністра нутраных справаў Савецкага Саюзу назначаны Сяргей Круглоў.**

## НА ФОНД БЕЛАРУСКАЙ КНІЖКІ

**На працягу ліпеня й жнівеня сёлета нашыя Прадстаўнікі ўва ўсіх краінах расьсяленьня Беларусаў праводзяць паводля падпісных лістоў збор складак-падпіскі на выдаваньне найлепшых твораў беларускай мастацкай літаратуры Выдавецтвам «Бацькаўшчына». Як мы ўжо пісалі, кажны ў разьмеры сваей складкі зможа атрымаць выбраныя ім кніжкі, выдадзеныя нашым Выдавецтвам.**

**Зьвяртаючы ўвагу на асабліва вялікую важнасьць перавыданьня лепшых твораў нашай прыгожай літаратуры, мы заклікаем усіх нашых Суродзічаў быць падпішчыкамі Фонду Беларускае Кніжкі, а ўсе нашыя Арганізацыі й прэсу горача просім памагаць арганізацыйна пры праводжаньні гэтае акцыі й належна яе прапагаваць.**

**Не павінна быць аніводнага Беларуса, які ня быў-бы ўдзельнікам Фонду Беларускае Кніжкі!**

**Выдавецтва «Бацькаўшчыны»**

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011



# Што нам патрэбна

Нельга абмінуць вялікага артыкулу Міколы Вярбы, зьмешчанага ў № 16 (147) «Бацькаўшчыны» пад сьціплым назовам — «Ці можам быць незадаволеныя»

А чаму не? У дэмакратычным сьвеце кажны мае права выказваць сваё незадаваленьне або задаваленьне з тае ці іншае прычыны. Аднак часам гэтыя выказваньні маюць спрэчны характар і таму рэдакцыйны (маё прыпушчэньне) падзагаловак — «Друкуецца ў парадку дыскусіі» — больш чым на месцы. І думаецца, што ў артыкуле Міколы Вярбы гэтая спрэчнасьць пачынаецца зь першага сказу і канчаецца апошнім.

Магчыма аўтар часткова і мае рацыю, што «ў сувязі з прызнаньнем Беларусі, як раўнапраўнага сябры Задзіночаных Нацыяў беларуская праблема набрала міжнароднае вагі», але нельга ўсё-ж цалкам утожсамліваць двух разуменьняў — БССР і Беларусь. Беларусь «набрала міжнароднае вагі» яшчэ 35 год таму, калі яе рэпрэзэнтавалі нашыя беларускія дзяржаўныя мужы, упаўнаважаныя на гэтае Першым Усебеларускім Кангрэсам, а не расейскі бальшавік Разанскага паходжаньня Кузьма Кісялёў, які рэпрэзэнтуе цяпер БССР і прызначаны на гэтае становішча Масквой. Цяжка сказаць (я-ж не палітык, а пісьменьнік), які з гэтых двух палітычных мамэнтаў мае найбольшую «міжнародную вагу» ў змаганьні за Незалежную Беларусь. Але-ж ад усяе душы хочацца (пісьменьнікі-ж, на думку палітыкаў, «кіруюцца пераважна эмоцыямі»), каб галоўнае значэньне ў вызнаньні правоў нашага народу на незалежнае існаваньне набыў голас Першага Ўсебеларускага Кангрэсу.

Цяжка таксама згадзіцца з аўтарам, што якраз, у сувязі з уваходам БССР у ЗН, Беларусамі пачалі найбольш цікавіцца замежныя навуковыя інстытуцыі і навукоўцы. А менавіта, што якраз быццам у сувязі з гэтым адзін ангельскі прафэсар у сваёй кнізе зьвяртае адпаведную ўвагу на нашую мову, пэўны амэрыканскі ўнівэрсытэт выдае карту СССР, дзе не абмінае й БССР, некаторы італьянскі навуковец публікуе працу аб нашай літаратуры, а другі таксама італьянскі навуковец піша рэцэнзію на гэтую працу і г. д. Не падлягае сумліву, што пры наяўнасьці ня БССР, а Беларускае Народнае Рэспублікі ўся гэтая зацікаўленасьць культурнага сьвету нашай нацыянальнай культурай набыла-б непараўнальна большы размах. Аднак гэтыя мае кароткія заўвагі датычаць толькі досыць вялікае прадмовы да артыкулу Міколы Вярбы, які, як ён кажа, «мае зусім іншую мэту». Таму і пераходжу цяпер да гэтае «іншае мэты».

Перш за ўсё хочацца загадзя зазначыць, што мэта гэтая досыць своеасаблівая. Паводля яе ўсё культурнае жыцьцё нашае эміграцыі (прынамсі з вонкавага боку) мусіць прытарноўвацца да патрабаваньняў паасобных замежных навукоўцаў і перакладчыкаў. Іншая справа, што гэтыя створаныя аўтарам замежныя навукоўцы і перакладчыкі — штучныя, ня рэальныя. І вось, заглядаючыся праз гэтыя падробленыя акуляры на нашую эміграцыю, аўтар утожсамлівае ейнае культурнае жыцьцё бадай што з голым месцам.

Запраўды — аўтар, выходзячы зь лепшых меркаваньнаў, сумуе, што ў галіне мовазнаўства ў нас быццам няма нічога апрача «Падручніка крывіцкае (беларускае) мовы». др. Я. Станкевіча. Ён адзначае далей «штучную й поўнае рэдактарскае выдумкі» мову «Веды» й «Зьнічу», напасьледак, спасылаючыся на здаровы розум, сьветчыць, што, апрача кагадзе адзначаных выданьняў, гэткім выданьням, як часапісы й газэты «Шыпшына», «Сакавік», «Запісы», «Божым Шляхам», «Моладзь», «Бацькаўшчына», «Беларус», «Беларускі Эмігрант» і «цэламу раду другіх часапісных і кніжных выданьняў», не стае добрае літаратурнае мовы і ўрэшце-рэштаў патэтычна зазначае: «Хто з паважных аўтараў-перакладчыкаў захоча мадзець над ратататарным выданьнем «Баявое Ускалосі» ці зьбіраць з газэты «Бацькаўшчына» ейныя «Літаратурныя дадаткі», пры чым з поўнай адсутнасьцю нашай рэчовай літаратурнай крытыкі? Хіба ніхто».

Прыкра бязумоўна для нас Беларусаў, нашчадкаў Францішка Скарыны, карыстацца на чужыне ратататарным друкам. Але адначасна прыгадваюцца латы на кажуху савецкага катаржніка Ўладзімера Хадыкі, пад якія ён зашываў свае новыя вершы. Не забывайма ніколі пра гэтыя латы! У параўнаньні зь імі наш вольны эміграцыйны ратататарны друк зьяўляецца вялікім дасягненьнем. Разам з тым мы добра ведаем тэхнічныя недахопы ратататарнага друку і ягоныя рэпрэзэнтацыйныя мінусы, але ... Мы ня ў стане цалкам перайсьці на звычайны друк не таму, што зьяўляемся «тараканамі ў саладусе», якія дбаюць толькі пра свой уласны дабрабыт, а таму, што нашая беларуская эміграцыя ў параўнаньні зь іншымі нацыянальнымі эміграцыямі нялічная і, ня гледзячы на сваю самаахвярнасьць, ня ў стане, на вялікі жаль, дазволіць сабе заўсёды на гэтую роскаш.

У першую чаргу трэба ўзяць пад вялікі сумліў вобраз створанага аўтарам «паважнага» навукоўца або перакладчыка, якіх цікавяць толькі энцыкляпэдыі, манаграфіі, анталёгіі і г. д. Запраўдны навуковец-гісторык часам вымушаны, фігуральна кажучы, праглынуць пуд архіўнага пылу перш, чым зрабіць адпаведны выснаў. Запраўдны навуковец-археалёг часам адбірае рыдлёўку ў грабара, каб хутчэй і разам з тым больш асьцярожна адчыніць таямніцу тысячагадовага кургана. Запраўдны навуковец-лінгвісты палюе за кажным дзедам ці бабуляй, каб пачуць ад іх тое ці іншае слова, і запісвае яго гэтак, як яно гучыць у народзе, а зусім не прабуе прытарнаваць яго да сваіх собскіх тэорыяў, бо разумее, што нельга сваім прыватным булыжнікам і шліфаваць народныя дыямэнты. І г. д., і г. д. У сувязі з усім гэтым прыгадваецца прафэсар Гарвардзкага ўнівэрсытэту ў ЗША, што працуе над гісторыяй Беларусі. Мы ні ў якім выпадку ня можам згадзіцца з тымі высновамі, якія ён зрабіў у сваёй гісторыі, але з пашанаю ставімся да мэтадаў ягонае навуковае працы. Ён, апрача выданьняў у БССР, пазнаёміўся ня толькі з усімі эміграцыйнымі друкаванымі й ратататарнымі выданьнямі, але й аб'езьдзіў рад штатаў ЗША і краінаў Эўропы, каб пагутарыць з удзельнікамі ці сьветкамі тых ці іншых падзеяў у нашай найнавейшай гісторыі. Навет больш — ведаючы пра падзел нашае эміграцыі, ён сустрэўся з рознымі прадстаўнікамі яе, каб дасягнуць найбольшае (на ягоны асабісты пагляд) аб'ектыўнасьці.

Далей аўтар, спрабуючы давесьці, што ў нас нічога рашуча ня зроблена ў галіне мовазнаўства, каб задаволіць запатрабаваньні замежных навукоўцаў, і ў прыватнасьці Ангельца Дэ Брэя, аж занадта абвальваецца на «Падручнік крывіцкае (беларускае) мовы» др. Я. Станкевіча. Аўтар чамусьці ня бачыць граматыкі Тарашкевіча, граматыкаў двух братоў Лёсікаў і г. д., аўтар чамусьці ня прыгадвае пра слоўнікі Насовіча, Дабравольскага, Ціхінскага, Некрашэвіча і Байкова, Ластоўскага, Гарэцкага, Касьпяровіча, Шатэрніка і г. д. Разьмер артыкулу не дазваляе мне пералічыць шмат іншых навуковых крыніцаў у гэтай галіне. Усе гэтыя выданьні зусім не зьяўляюцца «казёнными выданьнямі Савецкай Беларусі», а наадварот, спаленыя там за тое, што яны якраз не казённыя. Што датычыць «Падручніка» др. Я. Станкевіча, дык, не зьяўляючыся асаблівым сымпатыкам гэтага падручніка, я ўсё-ж мушу сьцьвердзіць, што дагэтуляшняя крытыка яго выходзіла пераважна зь не навуковых крыніцаў, а з палітыканска-дылетанскіх.

Нарэшце аўтара вельмі не задавальняе мова ўсяе нашае эміграцыйнае пэрыёдыкі. Што ня выданьне, на ягоны пагляд, дык зусім ці бадай што зусім апрычоная мова. Слоў няма — ёсьць у нас у гэтай галіне тыя ці іншыя недахопы. Сустракаюцца ў нашых выданьнях і наватворы, і архаізмы, і паветызмы, а часам і русыцызмы, палянізмы, украінізмы, навет чэхізмы й г. д. Але цалкам узятая мова эміграцыйных выданьняў выгодна адрозьніваецца ад мовы выданьняў БССР, якую ўжо на працягу дзесяцігодзьдзяў «старэйшы брат» гвалтам падганяе пад сваю «общепонятную» мову. Досыць перагарнуць камплект «Зьвязды» (адзін назоў чаго варты), каб у вачавідкі пераканацца ў гэтым. Тымчасам у нас няма аніякіх рашуча падставаў, каб чырванець за мову нашых эміграцыйных выданьняў.

Высновы, якія робіць аўтар, больш чым нечаканыя. Ён прапануе ў першую чаргу выдаць заплянаваныя яшчэ на бацькаўшчыне і ў Нямеччыне анталёгіі беларускае літаратуры. Можа гэта і ня дрэнна, а навет добра займець такія анталёгіі, але разам з тым ведама, што бадай кажная анталёгія не характэрная для мастацкае літаратуры таго ці іншага народу — яна ўлучае найлепшыя творы найлепшых аўтараў, пры чым гэтыя аўтары раскладзеныя па ейных балонках, як экспанаты па музэйных стэндах. Каб задаволіць наш асабісты эміграцыйны духовы голад у галіне навукі й мастацтва, а таксама каб належным чынам рэпрэзэнтаваць іх на чужыне, нам патрэбна штосьці зусім іншае.

Ёсьць у нас на эміграцыі навуковыя часапісы — «Запісы» і «Веда», якія зьяўляюцца друкаванымі ворганамі адмысловых навуковых інстытуцыяў. Наш агульны абавязак садзейнічаць у залежнасьці ад нашых асабістых здатнасьцяў і магчымасьцяў іхняму далейшаму росквіту і спрычыніцца да сталага кантакту паміж імі, але ў ніякім выпадку не дамагацца спалучэньня іх у вадно цэлае. Нам патрэбны таксама друкаваны літаратурна-мастацкі часапіс. Аб ягонай патрэбе даўно ўжо гаворыцца, тое-сёе навет робіцца, але...

Чамусьці перадумовай паўстаньня друкаванага літаратурна-мастацкага часапісу ў нас сталася стварэньне адзінага для ўсіх пісьменьнікаў і паэтаў на чужыне згуртаваньня. Прашу прабачэньня ў прыхільнікаў гэтага адзінага згуртаваньня, у сваіх найлепшых сяброў, але нашто нам прытрымлівацца савецкіх узораў і абавязкава ствараць штосьці накшталт ССПБ — літаратурнага калгасу. Каб дамагчыся гэтага абагульненьня, бальшавікі калісьці зьнішчылі згуртаваньні «Ўзвышша», «Полымя», «Маладняк», «Літаратурна-Мастацкую Камуну» (ня трэба палохацца шыльду), «Пробліск» і г. д. У нас на эміграцыі існуюць паасобныя пісьменьніцкія асяродзьдзі, як згуртаваньне «Шыпшына», сустань «Баявая Ускалось», літаратурныя сэкцыі пры адпаведных інстытуцыях — усе яны не зьяўляюцца чымсьці выпадковым і шутчным. Нам патрэбнае ня згуртаваньне, а Асацыяцыя беларускіх паэтаў і пісьменьнікаў на чужыне, у склад якой на роўных падставах уваходзілі-б усе паасобныя пісьменьніцкія асяродзьдзі, як і тыя пісьменьнікі, што стаяць паза імі. Асацыяцыя мела-б свой друкаваны літаратурна-мастацкі часапіс, што зусім ня перашкаджае паасобным згуртаваньням мець і свае літаратурна-мастацкія часапісы. Для рэдакцыйнае калегіі часапісу Асацыяцыі ня існуюць прэтэнсіі паасобных згуртаваньняў на пэўную плошчу ці месца ў гэтым часапісе, як ня існуюць для яе таксама стаж ці амбіцыі аўтараў — для яе існуюць толькі добрыя ці благія творы. Не падлягае ніякаму сумліву, што гэткі часапіс мае садзейнічаць і росту і росквіту нашае мастацкае літаратуры на чужыне. Што датычыць анталёгіяў, дык, не зьяўляючыся заціятымі ворагамі іхных укладальнікаў, мы ўсё-ж у першую чаргу зьяўляемся прыхільнікамі аўтараў новых добрых твораў.

«Ці можам быць незадаволенымі?» або — ці можам быць задаволенымі?, ці падабаемся мы «паважным» замежным навукоўцам, або не падабаемся ім? — гэта ўсё другараднае. Галоўнае, істотнае — спалучыўшы ўсе свае высілкі разам, стацца годнымі ў галіне навукі й мастацтва найлепшых традыцыяў свайго Народу й Бацькаўшчыны, а значыцца і належным чынам рэпрэзэнтаваць іх на чужыне ў вачох усяго вольнага культурнага чалавецтва!

**Юрка Віцьбіч**

# «Ну і нуда-ж якая сяньня!»

## АБО АБ АБСУРДАЛЬНАСЬЦІ САВЕЦКАЙ ВЫХАВАЎЧАЙ СЫСТЭМЫ

Звычайна савецкі друк ухіляецца ад асьвятляньня сыстэматычных і агульнамасавых правалаў і недахопаў у працы прадпрыемстваў, калгасаў і розных палітычна-грамадзкіх арганізацыяў. Між тым ёсьць нязвычайна шмат галін савецкай гаспадаркі і арганізацыяў, якія з году ў год сыстэматычна ня выконваюць плянаў і зацьверджаных праграмаў. У бальшыні выпадкаў нявыкананьне розных мерапрыемстваў залежыць ад той адмоўнай савецкай сыстэмы і гэтак званых ужо «праверанных вопытаў», згодна якіх няўхільна арганізуецца ўся праца.

На шматлікіх савецкіх нарадах, сходах, паседжаньнях, у газэтных артыкулах устаноўленая сыстэма парадку абгаварэньня працы, паводля якой спачатку трэба аддаць дань «мудраму» кіраўніцтву камуністычнай партыі, якая ўсё прадугледзіла, прадумала й вынесла адпаведныя пастановы й дырэктывы, у выніку чаго дасягнутыя «вялізарныя посьпехі». Далей трэба абавязкава паказаць на штодзенныя клопаты аб усіх галінах жыцьця самога «бацькі» ў тыя часы, калі ён яшчэ жыў.

Пасьля такога доўгага ўступу й дытырамбаў ў васьцярожнай форме трэба перайсьці да крытыкі недахопаў, правалаў, зрываў плянаў з паказаньнем на канкрэтных віноўнікаў або шкоднікаў. Абсурдальнасьць сыстэмы й бязглуздасьць дырэктываў, паводля якіх арганізуецца ўся праца, маўкліва абыходзяцца, а звычайна знаходзіцца асоба, часта зусім другарадная, на якую і ўзвальваецца ўся віна за нявыкананьне непамыльных партыйных дырэктываў. Такі парадак выступленьняў, дакладаў, дырэктываў і газэтных артыкулаў устанавіўся ня выпадкова.

Не адзначыўшы вялізарных, хоць і сумліўных, посьпехаў, абыйшоўшы «нязьмерную мудрасьць партыі й былога бацькі народаў», дакладчык, прамоўца або пісьменьнік ці газэтны карэспандэнт будзе абвінавачаны й залічаны ў паклёпнікі «цудоўнай савецкай рэчаіснасьці». А ўсе вельмі добра ведаюць, чым такія абвінавачаньні ў Савецкім Саюзе могуць скончыцца. Таму абавязкава трэба спасылацца на гэтыя «вялізарныя дасягненьні». Далей неабходна сакрушальна наваліцца й на недахопы, бо партыя патрабуе «крытыкі ня гледзячы на асобы і іх заслугі». Крытыка безасабовая будзе названая «алілуйшчынай», а можа й «ратазействам». Сыстэма цьвёрда ўстаноўленая й яе нязьменна павінны ўсе трымацца. Непамыльнасьць пастановаў і дырэктываў «мудрай» партыі старанна ахоўваецца ад крытыкі. А між тым бязглуздасьць дырэктываў і шкоднасьць устаноўленай сыстэмы часта бясспрэчныя.

Для прыкладу гніласьці ўстаноўленай сыстэмы возьмем хоць-бы мэтады выхаваўчай працы камсамольцаў, а разам з гэтым і ўсей савецкай моладзі, выхаваньне якой кіруецца тым-жа камсамолам. Як падае газэта «Камсамольская Праўда» за 24 красавіка сёлета, у камсамольскай арганізацыі Гомельскага паравознага дэпо сходы бываюць надзвычайна малалюдныя, нудныя й няцікавыя. Камсамольцы ўсякімі мэтадамі гэтыя сходы абмінаюць. А камсамольскі камітэт, пераняўшы сыстэму абманаў ад савецкіх установаў і ў першую чаргу ад вышэйшых партыйных арганізацыяў, хлусьлівымі справаздачамі, у якіх адзначаецца вялікая колькасьць дакладаў і многалюднасьць сходаў, прыкрываюць запраўднае становішча, што даклады чытаюцца ў пустых аўдыторыях.

Камсамольцы Гомельскага паравознага дэпо ня выпадковасьць. Ня лепшае

(Заканчэньне на 4-ай балоне)

турніца чыстай вады (у гэты час мой язык аблізваў мае губы), сказала:

— На здароўе! Будзьце тоўсты! Ежце із смакам яшчэ!

І, нібы заклапочаная маім здароўем маці, наліла мне яшчэ порцыён. Я ўмахаў яго. Паклала яшчэ. І той апынуўся ў тым-жа месцы.

Праз гадзіну як схапіла мяне за жывот, дык тату-маму крычаў, забыўся, як мяне завуць.

Пасьля па мястэчку дзейкалі, што мая гспадыня, замест рыбы, засмажыла зьмяю. Гэта зусім магчымы варыянт, бо, па-першае, бязь Ліна гэта агідная гісторыя не абыйшлася, па-другое — усё цела маё пакрылася нейкімі цёмнымі плямкамі — наяўны сымптон зьмяёвай атруты. Я і сам ня ведаю, якім цудам у жывых застаўся. У першую чаргу я ўськінуўся на гаспадыню:

— Вы мяне атруцілі. Каб рыбу есьці — на гэта ў мяне курсу ня было. У турму пасаджу, хоць памру!

Гаспадыня ламала рукі і божкалася, што яна ні ў чым ня вінна.

А мяне такі нявыносны боль заламаў, што я, ня помнячы нічога, застагнаў як недарэзаны вяпрук, і стралой паляцеў у больніцу.

Як на бяду мне, дохтарша, якую ўсё мястэчка за матку прызнавала, паехала ў вадпачынак, а доктар Крутагалоў (каб яму галаву адкруціла!) паехаў на эпідэмію трасцы. Ніякой эпідэміі ня было, але пасьля высьвятлілася. Ды ён і ня доктар быў, а захапляўся жаночай фігуральнай структурай. Як прыдзе ў больніцу прыгожая дзяўчына, дык ён загадае ёй распрануцца ды тры з палавінай гадзіны выстуквае, вымацвае яе.

На мястэчку ёсьць яшчэ прыватнік — доктар Зэлік. Дык добрыя людзі рагочуць, заходзяцца ад сьмеху. Падумайце: ня мог пазнаць, што яго жонка цяжарная і на працягу 9 месяцаў усім дурыў галаву:

— Маю жонку трэба везьці ў Маскву пад апэрацыю. У Беларусі няма такіх вучоных.

У жываце, бачыце, нейкі вопух, паводля яго слоў, арганізаваўся і расьце, расьце. А як прышоў фінал ды жонка застагнала і хутка дзяўчынку прывяла ў жыцьцё, дык ён вочы свае выпукліў.

Дык гэты доктар мог мяне на той сьвет накіраваць і дапамогу даў-бы ў вадмоўным сэньсе слова.

У больніцы засталася толькі акушэрка. Нават фэльчароў як вадою змыла. Жанчына памацала мой напукланы жывот, паціснула ў розных мясцох. Пры кажнай маніпуляцыі я галасіў:

— Ой, здыхаю! Ратуйце! Ня дайце разлучыцца з жыцьцём!

Спакойна сказала:

— Гостры гастрыт!

Дала нейкіх парахоляў. Тут нейкая баба прычапілася да акушэркі:

— У мяне жывот баліць, як цяжкое падыму. Дык і ў мяне гайстрыт? Што-ж ён такое? Гліст такі, ай што?

— Гліст, гліст, — замахала на яе акушэрка.

Баба высунулася ў пярэдні пакой і сваім суседкам:

— У мяне гліст, такі гостры, як іголка. Гостры гайстрыт. Ён зь мяне ўсё шлуньне выцягвае.

Мне не да сьмеху было. Прыняў зельле, ледзьве завалокся дамоў, а там яшчэ горш падкаціла.

Саромна мне было стагнаць на сваёй квартэры — не хацелася, каб мае енкі чула Крэйна. Узаўрэў я, але сьцягнуўся з ложка і паплёўся ў сасоньнік каля вёскі Вялікія Насы. Там на ўзлоньні прыроды сярод сьпеючых аўсоў і грэчкі я «охаў, ёкаў і стагнаў», як апяяў у вершу маю цяжкую хваробу Гарачы.

Птушкі сьпявалі, сьвяціла гарачае сонца па дубох зялёных, па соснах стромкіх, а я з болю грыз зямлю і кулдыкаўся, як уюн атручаны.

Урэшце не хапіла ўсьцерпу. Бачу, сьмерць нямінуча — не закрыешся анучай. Пабачыў на дарозе падводу, зь ёю ледзьве жывы даехаў дамоў.

Там мяне чакалі двое людзей: селянін Мікіта Корда, які разы два вазіў мяне па раёну, і выкладчык прыродазнаўства ў сямігодцы настаўнік Яжджыль.

Мікіта, пабачыўшы мой зялёны твар, замітусіўся і выбег з пакою. Праз пяць хвілін вярнуўся:

— Во баба мая вам раду прыслала! Праглынеце гэта — усё як рукой зьніме. Калі не адно, дык другое.

Я зірнуў на Мікіту. У ваднэй руцэ ў яго былі нейкія сушаныя грыбы, а ў другой карэц з вадой. Мікіта тлумачыў:

— Тут два грыбы. Адзін, во гэты — завецца чортава яйцо, дужа палзіцельны грыб ад рэзі ў пузе, трэба яго праглынуць ды запіць во гэтай сцаленай вадой з крынічкі. А калі не пасобіць, дык тады праглынуць другі грыб. Ён завецца пірдзіна, дужа сьмярдзючы грыб, але ўсё як рукой зьніме.

Прыродавед схапіў грыб у рукі:

— Дзіўна! Як народ кавярае навуковыя назвы. Гэты грыб па латыні завецца лікапэрдум. Відаць, што тут была калісьці досыць высокая культура, калі ў народзе была пашырана латынская тэрміналёгія.

А мне зусім ня было справы да лікапэрдума.

— Мне нічога не дапаможа! — крычаў я, калі Мікіта пхаў мне ў рот другі грыб і даваў запіваць вадою. — Нічога! Сьмерць мая прышла. Мяне атруцілі. Зьмяю засмажылі замест рыбы.

Мікіта прасьвятлеў:

— Дык тады нагавор трэба. Я ўмею ад вужакі й сіпучай зьмяі.

Я ўжо ляжаў, як няжывы чыў, што гаварылі над маім вухам, але ніякага руху зрабіць ня мог. Мікіта сьціснуў мой жывот і шаптаў:

— Ехаў Міхайла-архайла, сьвяты папіхайла, на агняной кабылі, з гострай мячой у руцэ. Мячой выразаў, агнёй выпякаў, па імхох, па балотах адсылаў; вы, гады, не зявайце, свае джгалы вымайце, у балоты напраўляйце. А не, то клікну Міхайлу-архайлу, сьвятога папіхайлу, ад вас і пылу ня будзе. Агнёй запячэ, мячой засячэ, мятлой разьмяце. Дасьць па зубах, па трэцяму языку!...

Я ляжаў у няпрытомнасьці. Мікіта і настаўнік Яжджыль пашлі дамоў, на зьмену ім прышоў Мамон. Боль зноў узмацніўся. Я стагнаў:

— Дружа мілы, Мамося ясны, забі мяне, ратуй мяне ад пакуты гэтай!

Захліпваючыся словамі, плачучы, разлучаўся зь нескарыстаным жыцьцём і даваў Мамону свае апошнія распараджэньні, як быць з маімі прычындаламі, што сказаць матцы. Часам нібы ў тумане ўспамінаў Крэйну і праяўляў надзвычайную моц волі. Я імкнуўся пяяць, каб троху спыніць ці сьцішыць грандыёзны боль у маёй вантробе. Я сьпяваў прыдушаным голасам, ад якога ў Мамона валосьсе ўгору ўздымалася:

— Баліць-жа мой жываточак —
Мусіць я памру.
Ой пайдзеце, прывядзеце,
Каго я люблю!

І раптам дзьверы адчыніліся. Крэйна! Вочы яе сумныя, спачуваючыя, не насьмешлівыя. Ні слова ня кажучы, бярэ шклянку з вадой, сыпе туды лыжку стоўчанага вугалю (бярозавага!!!) і тонам, не дазваляючым дыскусіі, кажа:

— Выпі, тав. Самсон!

Я выпіў і праз дзьве хвіліны боль адступіў. Я плакаў з радасьці і цалаваў яе калені. Заспакоены заснуў. У маіх галавах сядзела Крэйна, а я сьніў, што маё чало яна ўпрыгожыла ружамі.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011



# Беларусы ў Сьвеце

## Аўстралія

### АГУЛЬНЫ ГАДАВЫ СХОД ЗГУРТАВАНЬНЯ БЕЛАРУСАЎ У ВІКТОРЫІ

У нядзелю 7. 6. 1953 г. адбыўся ў Мэльбурне агульны гадавы сход Згуртуваньня Беларусаў у Вікторыі. Справаздачу зь дзейнсьці арганізацыі злажыў старшыня ўправы праф. М. Нікан. Як відаць зь яе, Згуртаваньне за мінулы пэрыяд часу прарабіла вялікую працу. І так у кірунку культурна-асьветным былі ладжаныя шматлікія лекцыі й рэфэраты з галіны беларусаведы й веды аб Аўстраліі, адзначаліся нашыя нацыянальныя сьвяты, гадавіны з нашай культурнай мінуўшчыні. Стараньнем Згуртаваньня наладжаныя былі два літаратурныя вечары, было выслана каля дзесятка пачкоў з харчаваньнем і вопраткай нашым патрабуючым суродзічам у Эўропе, а так-жа зьбіраліся й высылаліся грошы на беларускую прэсу, студэнтам, непрацаздольным суродзічам у Нямеччыне й Аўстрыі. Не пакідаліся без апекі й тыя Белсрусы ў Аўстраліі, якія знаходзіліся ў шпіталях, сыстэматычна зьбіраліся ахвяры на Беларускую Праваслаўную Аўтакефальную Царкву. Згуртаваньне ўтрымоўвала сувязь з многімі беларускімі арганізацыямі як у Аўстраліі, гэтак і ў іншых краінах сьвету. Асабліва цесным супрацоўніцтва было з Аб'еднаньнем Беларусаў у Новай Паўдзённай Валіі (Сыднэй) і Брацтвам Жыровіцкай Божай Маці ў Адэляйдзе (Паўдзённая Аўстралія). На вялікі жаль, не ўдалося навязаць супрацоўніцтва з Задзіночаньнем Беларусы ў Аўстраліі, якія знаходзіліся (Квінсленд). Згуртаваньне ўтрымоўвала лучнасьць з арганізацыямі некаторых іншых нацыянальнасьцяў, асабліва цесная сувязь была з Казакамі й Украінцамі.

Гэта былі-б з большага толькі фрагмэнты зь дзейнасьці Згуртаваньня Беларусаў у Вікторыі. Дзейнасьць гэтая ня была-б так эфэктоўнай, калі-б не ахвярнасьць сп. сп. М. Скабея і П. Мікуліча, у чыім доме амаль уся гэтая дзейнасьць і канцэнтравалася.

Пасьля дыскусіі над справаздачай і праслуханьня пратаколу Рэвізыйнай Камісіі на прапанову апошняй было вынесена ўступаючай управе абсалютoрыюм із спэцыяльнай падзякай старшыні ўправы праф. М. Нікану. У новую ўправу праз аклямацыі быў выбраны ўзноў праф. М. Нікан, як старшыня, а сябрамі ўправы бальшынёй галасоў былі выбраныя сп. сп. П. Мікуліч, У. Аксючыц, А. Казура і А. Калодка. У Рэвізійную Камісію ўвайшлі сп. сп. М. Каранеўскі, М. Скабей і Ф. Рамашка, а ў Сяброўскі Суд — сп. сп. Л. Нікан, А. Каранеўская і М. Казура.

Трэба верыць, што новая ўправа, узбагачаная дасьветчаньнямі зь мінулага году, у часе сваей кадэнцыі зробіць яшчэ большыя дасягненьні.

**А. Маханеўскі**

## Ангельшчына

### БЕЛАРУСЫ БРАДФОРДУ ЎШАНОЎВАЮЦЬ ПАМЯЦЬ ЯНКІ КУПАЛЫ

28 чэрвеня сёлета ў Беларускім Доме ў Брадфордзе адбылася ўрачыстая акадэмія, прысьвечаная памяці Янкі Купалы.

Акадэмію адчыніў старшыня Ўправы Аддзелу Згуртаваньня Беларусаў у Вялікабрытаніі на акругу Ёркшыр сп. Я. Калбаса, які выказаў жаль па нябошчыку, як вялікаму сыну Беларусі. Зьмястоўны й добра апрацаваны рэфэрат аб жыцьці й творчасьці Янкі Купалы прачытаў сп. П. Паўлоўскі. Хвілінай цішыні для ўшанаваньня памяці нашага вялікага нацыянальнага паэты й беларускім нацыянальным гымнам закончылася акадэмія.

Панахіда за супакой душы Янкі Купалы была адпраўленая а. А. Крытам у нядзелю 4 ліпеня ў Беларускай Капліцы пры Беларускім Доме ў Брадфордзе.

**Я. Крушына**

# Прарок зарубежніцтва у Аустраліі

### (ТРАГІ-КАМІЧНАЕ, АЛЕ ПРАЎДЗІВАЕ ЗДАРЭНЬНЕ)

Зараз-жа пасьля г. зв. «Другога Ўсебеларускага Кангрэсу» ў беларускай прэсе пэрыяду вайны паказаўся артыкул Яўхіма Кіпеля аб «дакладным» прабегу гэтага Кангрэсу. Якімсьці чынам адзін эгзэмпляр газэты з гэтым артыкулам трапіў у Аўстралію, дзе і вандруе паміж Мэльбурнам і Сыднэям — асяродкамі недабіткаў зарубежніцтва. Артыкул стаўся нейкім сьвятым аб'яўленьнем, зь якога зарубежнікі чэрпаюць усю сваю мудрасьць. Ня бывае ніводнай зборкі, на якой гэты артыкул ня быў-бы чытаны ўвесь або ў вадрыўках. Вось, прыкладам, у Мэльбурне ўжо быў чытаны аж 5 разоў і то за досыць кароткі пэрыяд часу. Спачатку рэфэрэнт, адзін і той-жа самы, нейкі Сідлярэвіч, ня мог прывыкнуць ані да беларускай мовы ані да кірыліцы, чытаньне для яго было чыстай мукай. Апошнім аднак часам відаць ужо вялікі поступ і трэба верыць, што цераз некалькі гадоў навучыцца ён Кіпелевай пісаніны напамяць.

Ня маючы вялікай собскай залі, Мэльбурскія зарубежнікі ўжо некалькі разоў прабавалі прачытаць Кіпелеў артыкул у Ўкраінскім Дыскусійным Клюбе. Гэта мелася быць так-жа й нагодай расправіцца з «крывічамі». Што-ж, «крывічы» — людзі непалахлівыя, прыйшлі, прыйшла і жменька зарубежнікаў на чале з М. Шнэкам — быўшым сябрам «Русской Православной Молодежи» ў Гамбургу і нядаўна кандыдатам на яшчэ аднаго зарубежніцкага япіскапа, прыйшоў і дажывотні рэфэрэнт Сідлярэвіч, прыйшла і жменька «малайцоў», добра перад гэтым падмацаваўшыся танным аўстралійскім вінoм, як ахарона «Штабу Беларускага Вызвольнага Руху». Начальнік Штабу, сьвежа авансаваны Астроўскім у маёры 26-ці гадовы Шнэк зьявіўся таксама. Бяда толькі — ня прыйшла ніводная асоба з Украінцаў. Урэшце, пасьля гадзіннага чаканьня, убег на залю сп. Кліяноўскі, сябра Ўкраінскага Дыскусійнага Клюбу, і перапрасіў прысутных, што вечар не адбудзецца, бо не ўдалося нікога з Украінцаў прыцягнуць на рэфэрат. Доўга прасілі зарубежнікі сп. Кліяноўскага, каб Украінскі Дыскусійны Клюб яшчэ раз вызначыў чысло рэфэрату. Мала сказаць — прасілі, малілі проста. Усіх аднак выперадзіў Аляксандар Субач, які, не шануючы сваей лысай галавы, да ног і рук кідаўся беднаму сп. Кліяноўскаму, просячы із сьлязамі ў вачох: «Панок, пане доктар і інжынер, у ім Вы ўсё пачуеце». Зьбянтэжаны такой формай просьбы, Украінец ня мог не сказаць стэарэтыповага: «Пабачым, пастараемся», і хутка вышаў з залі.

Артыкул аб г. зв. «Другім Усебеларускім Кангрэсе» так і ня быў да гэтага часу прачытаны ў Украінскім Дыскусійным Клюбе, а фанатычны Кіпелеў паклоньнік Аляксандар Субач, аб дзейнасьці якога калісь напішу, мусіў дробненька тлумачыцца і каяцца ня толькі перад шэфам штабу «Беларускага Вызвольнага Руху», але яшчэ дадаткова і на агульнай «адправе», гэта значыць у нашым цывільным жыцьці, на агульным сходзе арганізацыі, налічваючай ажно... 6 асобаў, мусіў тлумачыцца і каяцца за паніжэньне годнасьці змагара (?!) перад Украінцам, і то яшчэ ў прысутнасьці «крывічоў».

Аж гэтымі днямі быў ужо пяты раз адчытаны Кіпелеў артыкул аб «Кангрэсе». Праўда, зь некаторымі мадыфікацыямі. Ня было ўспомнена аб Астроўскім, як дажывотнім «прэзыдэнце», і ня было слоў Астроўскага: «Мы лучым наш лёс зь Фюрэрам і Нямеччынай». Былі затое, як звычайна, лаянкі на «крывічоў» і праклёны.

Яўхім Кіпель, прабачце — яго ны артыкул паляцеў лятунскай поштай у Сыднэй да самога палкоўніка Антона Булаўскага. Думаю, што палкоўнік Булаўскі (скончыў прысьпешаным тэмпам два курсы, ясна, карэспандэнцыйнай дарогай, выпшэйшых вайсковых камандзіраў «Беларускага Вызвольнага Руху) належна адсьвяткуе гадавіну «Кангрэсу».

**Цімох Кураноўскі**

# «Ну і нуда-ж якая сяньня!»

(Заканчэньне з 3-яй балоны)

становішча на вагона-будаўнічым заводзе, на камбінаце «Спартак», на заводзе імя Кірава і на іншых прадпрыемствах буйнага прамыловага гораду Гомеля. Гэтак на вагона-будаўнічым заводзе больш дваццаці камсамольцаў пакінулі наведваць вячэрнюю школу, а наагул сотні камсамольцаў, хлапцоў і дзяўчат, нідзе ня вучацца. «Сілы трацяцца, час ідзе, а вынікі? Непацяшаючыя!» — пэсымістычна адзначае «Камсамольская Праўда». Газэта з абурэньнем канстатуе, што камсамольцы гораду Гомеля «лёгкадумна» адносяцца да працы на прадпрыемствах: ня выконваюць плянаў, а шматлікія парушэньні працоўнай дысцыпліны сталіся звычайным зьявішчам. Газэта абвінавачвае Гомельскіх камсамольцаў і ў тым, што яны «няправільна вядуць сябе ў быту». Гэтая завуаляваная й маласлоўная заўвага гаворыць шмат аб чым. Тут і п'янства, хуліганскія ўчынкі, картачная гульня, ненармальныя дачыненьні да сямейных абавязкаў і інш.

Гомельскія камсамольцы не зьяўляюцца выключэньнем. Спынімся ў некалькіх словах на мэтадах і сыстэме працы сярод студэнтаў камсамольцаў Харкаўскага палітэхнічнага інстытуту. Праца камсамольскага камітэту пабудаваная выключна на адміністраваньні і масавых пакараньнях за самыя разнастайныя ўчынкі, якія сьветчаць аб гніласьці й абсурдальнасьці мэтадаў выхаваўчай сыстэмы. Так шэсьць студэнтак першага курсу інстытуту былі прыцягнуты да адказнасьці за арганізацыю «зацяжных» вечароў танцаў. Пры чым кару панесьлі ня толькі арганізатаркі зацяжных танцаў, але й студэнт Паладзенка, які, хоць і ня быў удзельнікам і арганізатарам гэтага «недапушчальнага» зьявішча, але ведаў, што камсамолкі зьбіраюцца на танцы, і сваячасова не данёс аб гэтым. На будаўнічым аддзеле інстытуту камсамольскае бюро за чатыры месяцы разгледзіла 23 камсамольскія справы, пры чым за 18 справаў вынесеныя пакараньні. Стыль працы сярод камсамольцаў у Харкаве, відаць, узяты з вышэйшых партыйных арганізацыяў. А між тым, паводля цьверджаньня «Камсамольскай Праўды», у Харкаўскім палітэхнічным інстытуце вялікая колькасьць студэнтаў не пасьпявае ў навуцы. Значыцца, адміністрацыйныя пакараньні не даюць вынікаў.

Мы ня схільны наагул абвінавачваць савецкай моладзі ў цяжкіх грахох. Усялякія адхіленьні ад нармальнага жыцьця зьяўляюцца вынікам благой сыстэмы выхаваўчай працы, пабудаванай на хвальшы й няпраўдзе, якая ідзе ў разрэз із здаровымі імкненьнямі моладзі. Гэтаму «перадавому маладзёжнаму атраду будаўнікоў камунізму» надаела рутына, сумная сыстэма працы на прадпрыемствах, нудныя трафарэтныя сходы й даклады, апека зь нязьменнай праграмай паводзінаў у прыватным жыцьці. Вось чаму, калі ў Гомелі ў палацы імя Леніна для камсамольцаў-чыгуначнікаў быў арганізаваны чарговы «камсамольскі чацьвер», які быў «насычаны» палітычным зьместам і дакладамі аб «гэніяльных навуковых працах бацькі народаў», аб стаханаўскіх мэтадах працы, аб перавыкананьні вытворчых плянаў. пасьля вечару пры выхадзе з палацу карэспандэнт газэты «Камсамольская Праўда» пачуў, як камсамольцы гаварылі: «Ну і нуда-ж якая сяньня!» Гэтымі кароткімі словамі вызначаецца ўвесь зьмест «камсамольскага чэцьверга» і жаль за затрачаны час.

**В. Б.**

# Даклады для сяброў Парыскага Блеку

Пасьля дакладу сп. Навасардзіяна аб армянскай палітычнай партыі «Дашнакцюцюн», аб якім шырака пісалася ў папярэднім нумары «Бацькаўшчыны», 25 чэрвеня адбыліся ў готэлі «Рэгіна» ў Мюнхэне два наступныя даклады, якія таксама мелі на мэце шырэйшае абзнаямленьне партнэраў Парыскага Блёку з праблемамі й гісторыяй паасобных нацыянальнасьцяў.

Першы даклад прачытаў Паўночна-Каўказец (Чаркес) сп. Наміток з Турэччыны, які пазнаёміў слухачоў з доўгавяковай гісторыяй Паўночнага Каўказу, а перадусім із 101 гадовым гэройскім змаганьнем Паўночна-Каўкасцаў з расейскім імпэрыялізмам, а таксама шырака гаварыў аб цяперашнім палажэньні і структуры паўночна-каўкаскай эміграцыі.

Другую лекцыю чытаў прэзыдэнт Рады БНР сп. М. Абрамчык, які пазнаёміў слухачоў з этнаграфічным, тапаграфічным і дэмаграфічным палажэньнем Беларусі, пасьля чаго перайшоў да гісторыі, спэцыяльна шырака характарызуючы нашае вызвольнае змаганьне ў вапошнім стагодзьдзі.

На заканчэньне кажнай дэлегацыі была ўручаная на памятку прыгожа выдадзеная Выдавецтвам «Бацькаўшчыны» паэма Якуба Коласа «Новая Зямля».

Абедзьве лекцыі, хаця прачытаныя імправізавана, былі вельмі цікавыя й зь вялікай увагай выслуханыя прысутнымі. Усе выразілі перакананьне, што такія імпрэзы шмат спрычыняцца да ўзаемнага зразуменьня й зацясьненьня дачыненьняў між паняволенымі бальшавізмам народамі.

**пс**

# Дарагія Суродзічы!

**Аб выданьні зборніка песьняў сьв. пам. М. Равенскага пісаў ужо сп. Чопчыц у газэце «Беларус» (№ 9/39), а Рэдакцыя гэтай газэты падала ў тым-жа нумары канкрэтную прапанову аб залажэньні спэцыяльнага фонду дзеля гэтае мэты.**

**Бязумоўна, выданьне гэткага зборніка было-б довадам нашае пашаны да дарагога Кампазытара, якога мы так любілі, ды ацэнаю Ягонае вялікае працы на ніве беларускай культуры.**

**Вось-жа выдавецтва «Наперад» бярэ на сябе ініцыятыву выданьня гэтага зборніка. У зборніку будуць зьмешчаныя беларускія народныя песьні, апрацаваныя Нябожчыкам, а таксама ягоныя собскія кампазыцыі (усяго каля 70 нумароў). Гэткі сьпеўнік з усебаковым характарам і багатым жанрам твораў, пачынаючы ад самых простых да складаных паліфанічных, што прадугледжаныя для ансамблю ўсялякага складу, мае запоўніць вялікую нястачу песеннай літаратуры, якая так балюча адчуваецца ў нас на эміграцыі. Сьпеўнік выйдзе пад тэхнічнай рэдакцыяй нашага ведамага кампазытара Алеся Карповіча, які ўжо працуе над гэтым.**

**Зборнік будзе мець каля 140 балонаў фармату вялікае васьмёркі (прыблізна як № 24 часапісу «Наперад»), і трэба прыкласьці ўсе стараньні, каб мастацка ён быў багата й прыгожа апрацаваны. Выданьне, бязумоўна, будзе зьвязанае зь вялікімі коштамі (клішэ на ноты й арнамэнты), але мы моцна ўпэўненыя, што нашае грамадзтва й арганізацыі прыйдуць нам з выдатнай грашовай дапамогай для ажыцьцяўленьня гэтага ганаровага заданьня. Кошт паасобнага эгзэмпляра сьпеўніка будзе выносіць прыблізна пяць амэрыканскіх даляраў.**

**Вось мы й зьвяртаемся з гарачым заклікам - просьбай да ўсіх суродзічаў, каму дарагая памяць кампазытара Равенскага й пашырэньня роднае песьні сярод чужынцаў і сваіх, прыйсьці з дапамогай у гэтай справе ў форме грашовых ахвяраў, ці падпісных перадплатаў (пяць амэр. даляраў за адзін эгзэмпляр). Грошы просім высылаць на адрас:**

Mr. V. Ščečka, 19, Place Hoover,
Lovain, Belgique.

**На гэты-ж адрас просіцца зьвяртацца таксама ўва ўсіх іншых справах, што будуць датычыць выданьня гэтага зборніка.**

**На назоў, вокладку ды мастацкае апрацаваньне зборніка абвяшчаем конкурс. За прынятыя праекты ўзнагародай будзе дармовы эгзэмпляр сьпеўніка, на падзагаловак якога праектуецца: «Беларускія народныя песьні для мяшанага хору».**

**ВЫДАВЕЦТВА «НАПЕРАД»**

# Усебеларускі Архіў

Выконваючы даручэньне Агульнага Зьезду з 14 сьнежня 1952 г., Управа Беларускага Інстытуту Навукі й Мастацтва прыступіла да арганізаваньня ў Нью Ёрку **Ўсебеларускага Архіву** беларускай эміграцыі.

Управа Беларускага Інстытуту робіць стараньні, каб так патрэбная ўстанова была як найхутчэй адчыненая й аддадзеная для карыстаньня ўсяму беларускаму грамадзянству бяз розьніцы палітычных паглядаў ці груповай прыналежнасьці.

Праведзеная пачатковая праца паказала, што арганізаваньне Архіву — справа насьпелая, і ўжо шмат хто згадзіўся перадаць свае прыватныя зборы для агульнага карыстаньня ці то на собскасьць Архіву, ці на ўмовах дэпазыту.

Усебеларускі Архіў будзе складацца з трох галоўных аддзелаў: **архіўнага, музэйнага й бібліятэчнага.** Архіўны аддзел зьбірае й перахоўвае акты, дакумэнты, рукапісы, успаміны, фатаграфіі, біяграфічныя матарыялы зь гісторыі Беларусі й зь гісторыі й жыцьця беларускай эміграцыі.

Музэйны аддзел зьбірае памяткі й прадметы, што маюць гістарычную, навуковую, мастацкую, этнаграфічную ці іншую вартасьць для будучых пакаленьняў. Сюды маюць належыць і творы беларускіх мастакоў, як абразы, скульптура, зарысоўкі, а таксама творы чужых мастакоў зь беларускаю тэматыкаю.

Бібліятэчны аддзел будзе намагацца канцэнтраваць ды ахоўваць усе друкі беларускія й аб Беларусі, як кнігі, брашуры, часапісы, газэты, ноты, паштоўкі, лістоўкі і г. д.

Інстытут бярэ на сябе абавязак і адказнасьць за справу аховы збораў ды за даступнасьць іх для навуковых і грамадзкіх патрэбаў. Дзеля сталай рупнасьці аб ахове сабраных каштоўнасьцяў і аб разьвіцьці Архіву, мае быць пакліканая з прадстаўнікоў грамадзянства адумысловая Архіўная Рада, як наглядна-дарадчы ворган кіраўніцтва Архіву.

Управа Беларускага Інстытуту паручае гэтую так важную й неабходную з нацыянальна-грамадзкага гледзішча ўстанову ўвазе й матарыяльнай ды маральнай апецы беларускай эміграцыі ўсіх краінаў сьвету, ды заклікае да перасыланьня ў Усебеларускі Архіў вышэй пералічаных матарыялаў. Просіцца таксама ўсе беларускія выдавецтвы перасылаць найменш па 3 эгзэмпляры ўсіх выданьняў для Архіву. За большую колькасьць Архіў будзе заўсёды вельмі ўдзячны, бо лішнія эгзэмпляры будуць выкарыстаныя для вымены зь іншанацыянальнымі архівамі й бібліятэкамі, лучнасьць зь якімі ўжо навязваецца.

Лісты, друкі, экспанаты трэба адрысаваць на дырэктара Ўсебеларускага Архіву Міколу Панькова:

**Mr. Nicolaus Pankou,** Director, All-Whiteruthenian Archives, 56—49, 59 Place. MASPETH 78, L. I., N. Y. USA.


**КУПЛЯЙЦЕ! — ВЫПІСВАЙЦЕ! ЧЫТАЙЦЕ!**

**Новыя беларускія кніжкі — шэдэўры беларускае літаратуры Выдавецтва «Бацькаўшчыны»: Паэма ЯКУБА КОЛАСА**

**„Новая Зямля“**

**зь вялікім крытычным артыкулам Р. Склюта.**

**Цана 3 амэрыканск. даляры або іхная раўнавартасьць у мясцовай валюце.**

**Драма ЯНКІ КУПАЛЫ ў 5-ёх актах**

**„Раськіданае Гняздо“**

**з крытычным артыкулам Р. Склюта.**

**Цана 1 амэрыканскі даляр або ягоная раўнавартасьць у мясцовай валюце.**

**П'еса ў 4-ох дзеях ЯНКІ КУПАЛЫ**

**„Тутэйшыя“**

**з абшырным уступным крытычным нарысам Р. Склюта.**

**Цана 1,30 амэрык. даляраў або іхная раўнавартасьць у мясцовай валюце.**

**За перасылку плаціцца асобна. Купляць і выпісваць непасрэдна з Адміністрацыі «Бацькаўшчыны», ад нашага Фінансавага Прадстаўніка ў Бэльгіі (Janka Žučka, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique), а таксама з усіх нашых Прадстаўніцтваў у паасобных краінах.**


## Нашыя Прадстаўніцтвы

**Ангельшчына:**
**Mr. Aleksander Lašuk,** 97 Moore Park Road, London S. W. 6.

**Бэльгія:**
**Mr. Borysevič,** 19, Place Hoover, Louvain.

**Данія:**
**J. Lobejko** c/o H. C. Jensen, Leifsgade 6 III tv. Kobenhavn S.

**Францыя:**
a) **Zygfryd Puzowski,** 158, rue Jules Guesde Levaillois-Perret (Seine).
b) **Bonifacy Prytycki,** 17, rue Roger Salengro Lys les Lannoy (Nord).

**Швэцыя:**
**Basil Lukaszyk** c/o Hammer Ringvagen N. 123/III, Stockholm.

**Аргентына:**
**Asociacion Bielorusa en la Argentina.** Calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio, Prov. Buenos Aires.

**Аўстралія:**
**Mr. Donat Jackievič,** 60 Fisher St., East Brisbane, Q-ld.
b) **Mr. L. Pašynkouski,** 60 Stawell St. Burnley, Melbourne, Vic., Australia.

**Бразылія:**
**Carlos Cimafejčyk,** Prasa 76, Tiridentes, Curitiba - Parana.

**Канада:**
**Mr. W. Nowicki,** 142 Gladstone Ave, Toronto, Ont.
b) **Mr. Franz Hankievich,** 3701 St. Dominique St., Montreal, Q.

**ЗША:**
a) **Mr. B. Danilovich,** 222 Suydam St., New Brunswick, N. J.
b) **Mr. M. Serdeczenko,** 7851 Sherwood Ave, Detroit 11, Mich.
c) **Mr. V. Dunec,** 2502 W. 7. St., Cleveland, Ohio.
d) **Mr. E. Budzka,** 723 W. Dekoven St., Chicago 7, Illinois.

**Новая Зэляндыя:**
**Mr. Marian Karanieuski,** 88, Hercules Drayve, Roxburg-Hydro.

**З гэтых Прадстаўніцтваў просім у паасобных краінах выпісваць «Бацькаўшчыну» й на іх адрас перасылаць за яе належнасьць.**

**З прычыны дэвізовых абмежаваньняў просім усіх нашых Прадстаўнікоў выручаныя за газэту грошы, як і за выдадзеныя «Бацькаўшчынай» кніжкі, перасылаць на адрас нашага фінансавага Прадстаўніка ў Бэльгіі:**
**Janka Žučka,** 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011